**Аляксандраў У.Л.**

**Роля музея МДВРК у выхаваўчым і навучальным працэсе.**

Музей МДВРК – структурнае падраздзяленне каледжа, якое адыгрывае адмысловую ролю ў яго дзейнасці. Створаны больш 10 гадоў таму, ён з'яўляецца месцам захавання і памнажэння памяці пра найбольш адметныя, яркія старонкі з гісторыі нашай навучальнай ўстановы. Любы музей – гэта не толькі "матэрыялізацыя" мінуўшчыны. Ён – жывая повязь часоў, культурны канал трансляцыі здабыткаў папярэднікаў у свядомасць сучаснікаў. Музеі пакліканы выхоўваць павагу да родных і чужых мясцін, да выбітных людзей у розных галінах дзейнасці і творчасці. Яны натхняюць наведвальнікаў на філасофскія роздумы аб сваім месцы ў гэтым жыцці: хто я? Што раблю? Што пакіну пасля сябе? Музеі паказваюць гарызонты поспехаў , ствараючы моцную матывацыю для тых, хто знаёміцца з дасягненнямі папярэднікаў.

Музей МДВРК імкнецца адпавядаць гэтым высакародным мэтам, ажыццяўляючы сваю дзейнасць па розных накірунках. Сярод найбольш істотных можна адзначыць наступныя.

1) Навукова-фондавая дзейнасць. Яе задача – пошук ці стварэнне, апрацоўка, захаванне, улік і класіфікацыя каштоўнасцяў, звязаных з гісторыяй каледжа. Дыпломы, граматы, удзячнасці, вымпелы, кубкі, сцягі, альбомы, фатаграфіі і многія іншыя рэчы складаюць пералік экспанатаў музея. Гэты спіс пастаянна папаўняецца. У прыватнасці, у бягучым навучальным годзе распачата акцыя "Гісторыя здзяйсняецца сёння": наведвальнікі (навучэнцы і куратары, госці з іншых устаноў і абітурыенты) па заканчэнні экскурсій распісваюцца у адмысловым памятным альбоме, пакідаюць зычэнні, дзеляцца ўражаннямі, а пасля туды дадаецца калектыўная фатаграфія. Велізарны патэнцыял у накірунку фондавай дзейнасці мае магчымы пошук і экспазіцыя рэчаў, звязаных з профілем каледжа: радыё- і тэледэталяў, электронных і вылічальных прыбораў, якія выкарыстоўваліся ў научальным працэсе (і ў вытворчасці) у мінулыя дзесяцігоддзі. Перфакарты і перфаленты, транзістары і калькулятары, рацыі і кампутары 60-х-70-х гадоў маглі б выклікаць у сучаснай моладзі цікавасць і здзіўленне. Яны маглі б выступіць наглядным увасабленнем імклівасці навукова-тэхнічнага прагрэсу, развіцця адукацыі і прамысловасці. Літаральна на нашых вачах прамільгнулі і сышлі ў нябыт дыскеты, пэйджэры, іншыя носьбіты інфармацыі і сродкі сувязі. Але трэба прызнаць, што музейная дзейнасць у гэтым накірунку вельмі працаёмкая, патрабуе вялікіх сумесных намаганняў.

2) Навукова-даследчая і пошукавая дзейнасць. Яе спецыфіка заключаецца ў пошуку, сістэматызацыі і захаванні каштоўнай інфармацыі пра гісторыю каледжа. У гэтым сэнсе гісторыя – гэта перш за ўсё людзі, чый прафесійны і асабісты лёс шчыльна і ярка пераплецены з лёсам нашай установы. За 52 гады існавання некалькі разоў мяняліся яе назва, статус, абсталяванне, спецыяльнасці. Але ў кожны момант радыётэхнічны каледж (тэхнікум) злучала таленавітая і самаадданая дзейнасць яе кіраўнікоў і выкладчыкаў, метадыстаў і выдаўцоў, бібліятэкараў і лабарантаў, псіхолагаў і выхавацеляў, інжынераў і тэхнікаў, вахтороаў і прыбіральшчыц. Сярод іх тыя, хто плённа працаваў ці працуе тут шмат дзесяцігоддзяў. Адна з бліжэйшых задач музея – праз інтэрв'ю ці ўспаміны нашых заслужаных ветэранаў складаць летапіс, жыццяпіс МДВРК. Добрымі словамі і светлымі пачуццямі мы ўзгадваем і тых працаўнікоў, хто пакінуў ужо гэты свет.

Асаблівую каштоўнасць мае інфармацыя пра індывідуальныя і калектыўныя дасягненні выкладчыкаў і навучэнцаў. Іх удзел і перамогі ў навуковых і адукацыйных, спартовых і тэхнічных, мастацкіх і выхаваўчых конкурсах, выставах, спаборніцтвах, алімпіядах знаходзяць сваё адлюстраванне ва ўзнагародах, частка з якіх становіцца экспанатамі музея. У гэтым плане мы ўдзячныя кафедрам і іншым падраздзяленням, якія пачалі ствараць свае летапісы, прадастаўляюць інфармацыяю і матэрыялы пра сваю дзейнасць. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, асабліва развіццё Internet, дазваляюць ажыццяўляць захаванне каштоўнай інфармацыі аператыўна, надзейна і ў велізарных аб'ёмах. Напрыклад, сайт МДВРК выступае не толькі як носьбіт актуальнай інфармацыі, але і мультымедыйны сродак яе захавання і распаўсюджвання. У планах музея – стварыць і запісаць для сайта "віртуальную" экскурсію, каб усе жадаючыя маглі пазнаёміцца з экспазіцыяй, не выходзячы з дома, офіса, аудыторыі. Апошні сказ адносіць нас да наступнай дзейнасці.

3) Экспазіцыйна-выставачная  дзейнасць. З ёю, па сутнасці, і асацыююцца ў свядомасці большасці музеі. Гэта - правядзенне экскурсій. Што тычыцца нашага музея, то за бягучы навучальны год яго наведаюць больш за 25 навучальных груп. Добрай традыцыяй стал паход у музей першакурснікаў, але і навучэнцы старэйшых курсаў з цікавасцю завітваюць у яго другі, трэці раз за вучобу. Шчыра мы сустракалі і нашых гасцей: калег з іншых (у тым ліку замежных) навучальных устаноў (Міжнародны інстытут кіравання з Архангельска, Мінскі Лінгвагуманітарны каледж), удзельнікаў гарадскіх метадычных аб'яднанняў, бацькоў і будучых абітурыентаў у Дзень адчыненых дзвярэй, ветэранаў у Дзень Абаронцы Айчыны.

4) Арганізацыйна-выхаваўчая дзейнасць. Яна вельмі разнастайная і ўключае ў сябе: прыцягненне навучэнцаў і настаўнікаў да працы ў музеі (за што асаблівую ўдзячнасць можна выказаць папярэдняму кіраўніку музея – выкладчыцы гісторыі Курсевіч С.Р.); правядзенне куратарскіх гадзін і конкурсаў на базе музея (выкладчыкі Булацкая А.С., Саўчанка В.С.), правядзенне ідэалагічных, выхаваўчых і святочных мерапрыемстваў ( Рыжыкава В.М., Чатырбок Т.Ю.), правядзенне выставаў (Башкірава Н.Б), правядзенне віктарын па гісторыі каледжа (Манкевіч А.А., Аўчарэнка Н.В. і інш.).

5) Навукова-метадычная дзейнасць. У яе рамках кіраўнік і іншыя члены Савета музея рэгулярна вывучаюць сучасную навуковую літаратуру па музеязнаўстве, бяруць кансультацыі у прафесійных працаўнікоў гэтай галіны, удасканвальваюць свой прафесійны досвед на ніве нялегкай, але цікавай і важнай музейнай справы. Часткай гэтай работы можна лічыць і дадзены артыкул.

Кожны дзень нашай працы (а для вучняў – вучобы) у МДВРК павінен быць варты найлепшых старонак яго слаўнай гісторыі. Мы ўсе яе пішам разам.

Библиотека БГУИР